Уладзімір Падалінскі

# ПРАДСТАЎНІЦТВА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА НА ЛЮБЛІНСКІМ СОЙМЕ 1569 ГОДА

*Удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай*

Мінск
Выдавец А. М. Янушкевіч
2017

УДК 94 (476)«1569»
ББК 63.3(4Беи)44
П12

Навуковы рэдактар
А. А. Радаман

Рэцэнзенты:
В. Ф. Голубеў, доктар гістарычных навук, прафесар
В. У. Галубовіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**Падалінскі, У. А.**
П12 Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай / Уладзімір Падалінскі ; навук. рэд. А. А. Радаман. — Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. — 240 с.
ISBN 978-985-7165-42-1.

Манаграфія прысвечана дзейнасці і персанальнаму складу прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме ў ліпені – жніўні 1569 г. У кнізе аналізуюцца соймавыя дыскусіі і рашэнні па вызначэнні дзяржаўна-праававога статусу ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай, забеспячэнні абароны краіны, вырашэнні мясцовых і асабістых спраў. Упершыню робіцца спроба стварыць калектыўны партрэт велікакняжацкіх сенатараў і земскіх паслоў, якія ўдзельнічалі ў працы сойма.

Разлічана на навукоўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 94 (476)«1569»**
**ББК 63.3(4Беи)44**

**ISBN 978-985-7165-42-1**

© Падалінскі У. А., 2017
© Афармленне. Выдавец А.М. Янушкевіч, 2017

*Маім бацькам*
*прысвячаю*

# УВОДЗІНЫ

Заключэнне ў 1569 г. Люблінскай уніі паміж Вялікім Княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім і Каронай Польскай здаўна стала аб'ектам пільнай увагі гістарычнай навукі розных краін. Гісторыкі падрабязна даследавалі самыя разнастайныя аспекты гэтага саюза, палітычную барацьбу вакол яго заключэння, прычыны і падрыхтоўку, сутнасць, умовы і вынікі. Вывучалася і ўласна праца супольнага сойма ў Любліне, які працягваўся з 10 студзеня па 12 жніўня 1569 г. Праўда, галоўным чынам разглядаліся падзеі на сойме і вакол яго да 1 ліпеня, г.зн. непасрэдна да заключэння уніі. Затое ход соймавых пасяджэнняў з 2 ліпеня па 12 жніўня 1569 г., апісваўся даволі агульна. Аднак і па фармальных, працэдурных прыкметах, і па змесце разглядаемых пытанняў ды прынятых рашэнняў гэты адрэзак Люблінскага сойма з'яўляўся асобнай падзеяй у гісторыі новаўтворанага дзяржаўнага аб'яднання. Па сутнасці, можна смела казаць, што з 2 ліпеня па 12 жніўня 1569 г. у Любліне адбываўся першы вальны сойм Рэчы Паспалітай[1]. На яго пасяджэннях абмяркоўваліся і вырашаліся праблемы, нявырашаныя па дагавору уніі і прынцыпова важныя для станаўлення новага палітычнага саюза «абодвух народаў». Шмат у чым менавіта ў ліпені–жніўні 1569 г. акрэсліваліся тыя шляхі, па якіх будзе адбывацца далейшае гістарычнае развіццё ўсёй Рэчы Паспалітай і народаў, аб'яднаных у яе складзе, у тым ліку і беларускага.

[1] Такі характар працы Люблінскага сойма ў ліпені – жніўні 1569 г. ужо адзначаўся ў гістарычнай навуцы: Лаппо И.И. Великое княжество Литовское от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). Опыт исследования политического и общественного строя. Т. 1. СПб., 1901. С. 73; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy (Stosunki polsko-litewskie w latach 1569–1588). Warszawa, 2002. S. 41.

У адзінкавых працах расійскай[2] і польскай[3] гістарыяграфіі закраналіся толькі ключавыя моманты працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай: размежаванне кампетэнцыі земскіх і дворных маршалкаў, вызначэнне захадаў па абароне ВКЛ ва ўмовах вайны з Маскоўскай дзяржавай, месца пасяджэнняў і склад сойма, дзяржаўна-прававы статус Інфлянтаў у складзе Рэчы Паспалітай, далучэнне ўкраінскіх зямель і Падляшша да Польшчы. На важнейшыя аспекты дзейнасці дэлегацыі ВКЛ на Люблінскім сойме ў ліпені–жніўні 1569 г. коратка звярталася ўвага і ў беларускай гістарычнай навуцы[4]. Аднак спектр праблем, якія ўздымаліся ў Любліне ўжо пасля заключэння уніі, быў куды большы і закранаў ледзьве не ўсе сферы жыцця тагачаснага шляхецкага грамадства Вялікага Княства і Кароны. Таксама ў гістарыяграфіі давалася агульная характарыстыка выніковых актаў сойма. Так, адной з соймавых ухвалаў, да якой затым неаднаразова звярталася гістарычная навука, была ўхвала аб стварэнні камісіі для рэдагавання (папраўы) Статута ВКЛ 1566 г.[5] Асобна аналізаваліся некаторыя рашэнні караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста, прынятыя ў час сойма[6]. Такім чынам, гісторыкамі збольшага разглядаліся толькі галоўныя вынікі працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай, затое ўвесь комплекс пытанняў, які актуалізаваўся на яго пасяджэннях сенатарамі і земскімі пасламі Вялікага Княства Літоўскага, а таксама іх удзел у абмеркаванні,

[2] Лаппо И.И. Великое княжество Литовское от заключения Люблинской унии… С. 62–78; Любавский М.К. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства. М., 1900. С. 838–846; Он же. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно / Подгот. к печати Д.В. Карев. Минск, 2012. С. 389–390. Гл. таксама: Иловайский Д. Последний Ягеллон и Люблинская уния // Русский вестник. 1888. Т. 198. № 9. С. 37–42.

[3] Halecki O. Dzieje unii jagiellońskiej: W 2 t. T. 2. Kraków, 1920. S. 316, 333, 337, 345–349; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 17, 23, 41–57.

[4] Падалінскі У., Собалева Л. Люблінская унія 1569 г. // Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2008. С. 471–473.

[5] Гл. напр.: Лаппо И.И. Литовский Статут 1588 года. Т. 1: Исследование. Ч. 1. Каунас, 1934. С. 186–207; Bardach J. O dawnej i niedawnej Litwie / Uniwersytet im. A. Mickiewicza w Poznaniu. Seria historia, 141. Poznań, 1988. S. 39–53; Wisner H. Unia Lubelska i III Statut Litewski z roku 1588 // Zapiski Historyczne. T. 51. 1986, z.1. S. 23–43.

[6] Ліцкевіч А. Распараджэнні Жыгімонта Аўгуста адносна ўласных гаспадарскіх (вялікакняскіх) маёнткаў пасля заключэння Люблінскай уніі 1569 году (два дакументы з 52-й Кнігі запісаў Метрыкі ВКЛ) // METRICIANA: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага. Том II. Мінск, 2004. С. 35–56.

падрыхтоўцы і прыняцці соймавых рашэнняў фактычна застаўся па-за ўвагай даследчыкаў. Адпаведна, адной з пастаўленых намі даследчых задач з'яўляецца аналіз палітычнай пазіцыі дэлегацыі ВКЛ па разнастайных праблемах дзяржаўнага жыцця, прычыны, матывы, галоўныя накірункі, наступствы і вынікі яе дзейнасці на пасяджэннях першага супольнага сойма Рэчы Паспалітай. Пры гэтым падкрэслім, што соймавая дзейнасць кароннай дэлегацыі будзе разглядаецца намі толькі ў сувязі з тымі пытаннямі, якія непасрэдна датычылі ці ўплывалі на пазіцыю вялікакняжацкіх сенатараў і паслоў. Яшчэ раз заўважым, што ў Любліне ў ліпені–жніўні 1569 г. закранылася надзвычай шырокае кола праблем як унутранай, так і знешняй палітыкі Кароны і Вялікага Княства. Таму з навуковымі даследаваннямі па тых ці іншых пытаннях, што абмяркоўваліся на сойме, можна будзе азнаёміцца ў адпаведных главах працы. Аднак тут лічым неабходным асобна адзначыць манаграфіі Ежы Ахманьскага[7], Мітрафана Доўнар-Запольскага[8], Анджэя Закшэўскага[9], Генрыка Лаўмяньскага[10], Паўла Лойкі[11] і Андрэя Янушкевіча[12], без якіх было б немагчыма ў поўнай меры зразумець сацыяльна-палітычны, прававы, эканамічны і ваенна-дыпламатычны кантэкст дзеянняў сенатараў і земскіх паслоў Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме ўлетку 1569 г.

Яшчэ адным надзвычай важным накірункам даследавання, які абсалютна выпаў з-пад увагі гісторыкаў, з'яўляецца вывучэнне асабовага складу прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на сойме ў Любліне ў ліпені–жніўні 1569 г. Падкрэслім, што ў дадзеным выпадку тэрмін «прадстаўніцтва ВКЛ» разумеецца ў яго шырокім значэнні, г.зн. рэпрэзентацыя ўсяго Вялікага Княства і яго абывацеляў[13]. Такім чынам, соймавае прадстаўніцтва ВКЛ

[7] Ochmański J. Historia Litwy. Wyd. 3, poprawione i uzupełnione. Wrocław etc., 1990.

[8] Доўнар-Запольскі М.В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах / Падрыхт. да друку: А.І. Груша, Р.А. Аляхновіч. Мінск, 2009.

[9] Zakrzewski A. Wielkie Księstwo Litewskie (XVI–XVIII w.). Prawo–ustrój–społeczeństwo. Warszawa, 2013.

[10] Łowmiański H. Studia nad dziejami Wielkiego Księstwa Litewskiego. Poznań, 1983; Idem. Polityka Jagiellonów. Wyd. II / Do druku przygotował K. Pietkiewicz. Poznań, 2006.

[11] Лойка П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI–першай трэці XVII ст. Мінск, 2002.

[12] Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. Мінск, 2007.

[13] Grzybowski K. Teoria reprezentacji w Polsce epoki Odrodzenia. Warszawa, 1959. S. 10–18.

складалася з дзвюх частак: земскіх паслоў, абраных на сойм ад шляхецкіх карпарацый паветаў і ваяводстваў Вялікага Княства («прадстаўніцтва» ў вузкім значэнні), і сенатараў, якія ўваходзілі ў склад верхняй палаты сойма паводле займаемых пасадаў і нікім непасрэдна не абіраліся (хаця ўскосна некаторыя з іх, у прыватнасці, ваяводы і кашталяны, былі прадстаўнікамі і «сваіх» ваяводстваў). Не будзем забывацца, што сенатары і земскія паслы, якія бралі ўдзел у соймавай працы, абмеркаванні і прыняцці рашэнняў, былі звычайнымі людзьмі са сваімі інтарэсамі, патрэбамі, уяўленнямі, нормамі паводзінаў, адметнай свядомасцю і каштоўнасцямі. Яны павінны былі рэпрэзентаваць і дзяржаўныя інтарэсы Вялікага Княства, і разнастайныя патрэбы даволі шырокіх масаў шляхты, і, урэшце, уласныя інтарэсы. Усё гэта непасрэдна ўплывала на іх соймавую дзейнасць. Таму без аналізу персанальнага складу прадстаўніцтва ВКЛ проста немагчыма адэкватна даследаваць і разумець працу дэлегацыі Вялікага Княства на сойме 1569 г. Тым больш, што асабовы склад прадстаўніцтва ВКЛ пад час заключнага этапа сойма ў Любліне (з 7 чэрвеня па 12 жніўня 1569 г.) цалкам вядомы[14], што надзвычай рэдка ў дачыненні да вальных соймаў Рэчы Паспалітай апошняй трэці XVI — першай паловы XVII ст. Больш-менш падрабязныя біяграфіі некаторых удзельнікаў Люблінскага сойма 1569 г., пераважна, сенатараў, змешчаны ў Польскім біяграфічным слоўніку. Некаторым асобам, напрыклад, Мікалаю Крыштафу Радзівілу Сіротку, прысвечаны асобныя манаграфіі[15]. Аднак спробаў стварыць свайго роду калектыўны партрэт дэлегацыі Вялікага Княства Літоўскага на першым вальным сойме Рэчы Паспалітай у гістарыяграфіі фактычна не прадпрымалася[16].

[14] Нагадаем, што першы склад дэлегацыі ВКЛ пакінуў пасяджэнні Люблінскага сойма ўноч на 1 сакавіка 1569 г. Аднак пад ціскам розных абставін велікакняжацкая дэлегацыя, ужо ў значна змененым складзе, вярнулася ў Люблін у пачатку чэрвеня 1569 г. і працавала там да заканчэння сойма.

[15] Kempa T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł «Sierotka» (1549–1616) wojewoda wileński. Warszawa, 2000. Гл. таксама дапоўненае беларускамоўнае выданне: Кэмпа Т. Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка (1549–1616). Віленскі ваявода / навук. рэд. А. Шаланда; пер. з пол. С. Петрыкевіч. Мір, 2016. Беларускія даследчыкі Георгій Галенчанка, Анатоль Грыцкевіч, Іван Саверчанка прысвяцілі навукова-папулярныя працы такім удзельнікам сойма ў Любліне, як Астафей Валовіч, Адам Пацей, М.К. Радзівіл Сіротка, Раман Сангушка, Рыгор Хадкевіч: Саверчанка І. Астафей Валовіч: Гісторыка-біяграфічны нарыс. Мінск, 1992; Славутыя імёны Бацькаўшчыны: Зборнік. Вып. 1. Мінск, 2000. С. 28–38, 52–63, 87–99; Вып. 2. Мінск, 2003. С. 54–65, 119–127.

[16] Першасны аналіз персанальнага складу земскага прадстаўніцтва (паслоў ад ваяводстваў і паветаў) ВКЛ на Люблінскім сойме ўлетку 1569 г. быў зроблены

Методыка комплекснага даследавання соймавага прадстаўніцтва ў Кароне Польскай і Рэчы Паспалітай XVI–XVII стст. пачала распрацоўвацца ўжо ў 1970-х — пачатку 1980-х гг. вядомымі польскімі гісторыкамі Ірэнай Канеўскай, Янам Сэрэдыкам, Ганнай Філіпчак-Коцур, Уладзіславам Чаплінькім і інш.[17] Пазнейшыя працы Генрыха Літвіна, Іаланты Хаіньскай-Мікі і таго ж Я. Сэрэдыкі значна пашырылі кола крытэрыяў, паводле якіх аналізуецца прадстаўніцтва на соймах Рэчы Паспалітай[18]. Ёсць свае напрацоўкі па дадзенай праблематыцы і ў гістарычнай навуцы Беларусі, Літвы ды Украіны[19]. Аднак падкрэслім, што даследаванне сойма-

намі ў: Padalinski U. The Representation of the Grand Duchy of Lithuania in the Final Stage of the Seym of Lublin (June–August 1569) // Zapiski Historyczne. T. 79. 2014, z. 4. S. 27–51. Аналіз супольнасці каронных паслоў на Люблінскі сойм 1569 г. гл. у: Ferenz M. Posłowie koronni na sejmie unii lubelskiej (unie polsko-litewskie w dyskusji sejmowej) // Zeszyty Naukowe Uniwersytetu Jagellońskiego. Prace Historyczne. T. 141. 2014, z. 2. S. 367–383.

[17] Czapliński W., Filipczak-Kocur A. Udział senatorów w pracach sejmowych za Zygmunta III i Władysława IV // Przegląd Historyczny. 1978. T. 69, z. 4. S. 665–676; Filipczak-Kocur A. Senatorowie i posłowie na sejmie «pacyfikacyjnym» w 1589 r. // Czasopismo Prawno-Historyczne. 1982. T. 34, z. 2. S. 197–212; Eādem. Senatorowie i posłowie koronni na sejmie 1607 roku // Przegląd Historyczny. 1985. T. 76, z. 2. S. 291–303; Kaniewska I. Małopolska reprezentacja sejmowa za czasów Zygmunta Augusta (1548–1572). Kraków, 1974; Seredyka J. Posłowie Rzeczypospolitej na sejm „ratyfikacyjny» w 1629 r. // Sprawozdania Opolskiego Towarzystwa przyjacół Nauk. Wydział Nauk Historyczno-Społecznych. Nr. 15 (1977/1978). Opole, 1979. S. 23–33. Такая ж методыка выкарыстоўваецца, напр., у: Kaczorowski W. Biskupi, wojewodowie i kasztelanowie wileńscy na sejmach za panowania Zygmunta III Wazy // Wilno–Wileńszczyzna jako krajobraz i środowisko wielu kultur. Materiały I Międzynarodowej konferencji, Białystok 21–24.IX.1989. W 4 tomach pod red. E. Feliksiak T. II. Historia i pamięć. Białystok, 1992. S. 53–72.

[18] Choińska-Mika J. Sejmiki koronne XVI–XVII wieku. Problemy badawcze // Praktyka życia publicznego w Rzeczypospolitej Obojga Narodów w XVI–XVIII wieku. Materiały XVIII konferencji Komisji Lituanistycznej przy Komitecie Nauk Historycznych PAN w dniach 22–23 września 2009 roku / Pod red. U. Augustyniak i A. Zakrzewskiego. Warszawa, 2010. S. 20; Filipczak-Kocur A., Seredyka J. Stan badań nad dziejami parlamentaryzmu polskiego w latach 1573–1647 i postulaty // Parlamentaryzm w Polsce we współczesnej historiografii / Praca zbior. pod red. nauk. J. Bardacha przy współdziale W. Sudnik. Warszawa, 1995. S. 77–78; Litwin H. Równi do równych: kijowska reprezentacja sejmowa 1569–1648. Warszawa, 2009. S. 8–9, 25–41; Parlamentarzyści polscy od XVI do XX wieku. Stan badań i postulaty / Pod red. J. Seredyki i przy współudziale D. Kurpiers-Schreiber. Opole, 1999; Seredyka J. O ujednolicenie badań nad parlamentarzystami epoki staropolskiej // Parlamentaryzm i prawodawstwo przez wieki. Prace dedykowane prof. S. Płazie w siedemdziesiątą rocznicę urodzin / Pod red. J. Malca i W. Uruszczaka. Kraków, 1999. S. 23–29; Idem. Senatorowie Rzeczypospolitej na sejmach Zygmunta III Wazy (1587–1632) // Rozprawy z dziejów XVI i XVII wieku. Poznań, 2003. S. 155–237.

[19] Гл. напр.: Галубовіч В. Паслы Полацкага ваяводства ВКЛ на соймы Рэчы Паспалітай у 1558–1668 гг. // Герольд-Litherland. №18. Горадня-Менск, 2011. С. 37–40;

вай рэпрэзентацыі Вялікага Княства мае значныя асаблівасці ў параўнанні з вывучэннем соймавай рэпрэзентацыі Кароны, што абумоўлена сацыяльна-палітычнымі і этнаканфесійнымі адметнасцямі шляхецкага грамадства ВКЛ. Такім чынам, у нашай працы ставіцца задача прааналізаваць персанальны склад прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на першым вальным сойме Рэчы Паспалітай. Супольнасць сенатараў і земскіх паслоў будзе аналізавацца з пункту гледжання трыманых імі пасадаў, з улікам ступені іх сацыяльнай актыўнасці, г.зн. удзелу ў грамадска-палітычным і эканамічным жыцці, этапаў кар'еры, разнастайных сувязяў у шляхецкім асяроддзі, палітычнай і прававой культуры. Неаднароднасць сацыяльнага і этнаканфесійнага складу шляхецкага грамадства ВКЛ абумоўлівае таксама неабходнасць даследавання сацыяльнага статусу, маёмаснага становішча, этнічнага паходжання і канфесійнай прыналежнасці соймавых прадстаўнікоў Вялікага Княства.

Акрамя таго, па меры напісання дадзенай працы перад намі паўстала яшчэ адна даследчая праблема — праблема існавання ў ВКЛ самастойнага шляхецкага руху, незалежнага, у першую чаргу, ад магнатэрыі Вялікага Княства. Ці звесткі аб працы велікакняжацкай дэлегацыі на Люблінскім сойме ўлетку 1569 г. даюць магчымасць выявіць нейкія ідэі, з якімі гэты рух выступаў, вызначыць сацыяльныя групы шляхты, якія ён прадстаўляў, і, нарэшце, назваць канкрэтных палітычных лідараў, якія дзейнічалі ў яго інтарэсах? Адказ на гэтыя пытанні вельмі важны для характарыстыкі палітычнай сістэмы ВКЛ. У прыватнасці, без факта існавання самастойнага руху шляхты немагчыма весці гаворку і аб шляхецкай дэмакратыі ў ВКЛ[20]. У цэлым, спадзяемся,

Падалінскі У. Праблемы даследавання земскага прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на вальных соймах Рэчы Паспалітай (на прыкладзе заключнага этапа Люблінскага сойма 1569 г.) // Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура: зб. навук. арт. У 2 ч. Ч. 1 / Уклад. А.А. Скеп'ян; рэдкал.: У.Р. Гусакоў [і інш.]. Мінск, 2017. С. 209–220; Burba D., Jurgaitis R., Karvelis D., Mačiukas Ž., Ragauskienė R., Ragauskas A. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės parlamentarų (XV–XVIIIa.) biografinis žodynas: problemos iškėlimas // Parlamento studijos. 2004. № 2. S. 18–55; Jakovenko N. Posłowie województw wołyńskiego, kijowskiego i bracławskiego na sejmach Rzeczypospolitej w końcu XVI i w pierwszej połowie XVII wieku (Próba portretu zbiorowego) // Społeczeństwo obywatelskie i jego reprezentacja (1493–1993) / Praca zbior. pod red. nauk. J. Bardacha przy współdziale W. Sudnik. Warszawa, 1995. S. 88–93; Padalinski U. The Representation of the Grand Duchy of Lithuania… S. 27–51.

[20] Навуковая праблема рэальнага існавання ў ВКЛ шляхецкай дэмакратыі ўжо пастаўлена ў гістарыяграфіі, але, безумоўна, патрабуе свайго далейшага падрабязнага даследавання: Галенчанка Г.Я. Развіццё шляхецкай дэмакратыі

што комплексны аналіз дзейнасці і персанальнага складу дэлегацыі Вялікага Княства Літоўскага на першым вальным сойме Рэчы Паспалітай дазволіць нам зрабіць грунтоўны зрэз сацыяльна-палітычнай гісторыі Беларусі трэцяй чвэрці XVI ст.

Для паспяховага вырашэння пастаўленых даследчых праблем існуе шырокі спектр разнастайных гістарычных дакументаў. Прычым, значная колькасць матэрыялаў на дадзены момант ужо надрукавана. Крыніцы па тэме даследавання можна падзяліць на дзве асноўныя групы: *дакументальныя* і *наратыўныя*.

Дакументальныя (заканадаўчыя і справаводчыя) крыніцы дазваляюць прасачыць арганізацыю, ход і вынікі працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай. Так, захаваліся дакументы па скліканні на 10 траўня 1569 г. соймікаў у паветах і ваяводствах ВКЛ, у тым ліку гаспадарскія інструкцыі («*навуки*») і соймавыя лісты, падрыхтаваныя ў канцылярыі ў канцы красавіка таго года[21]. Вельмі маглі б дапамагчы больш дакладна і ўсебакова адлюстраваць стаўленне шырокіх колаў шляхты да актуальных праблем грамадска-палітычнага жыцця краіны пасольскія інструкцыі, складзеныя на павятовых сойміках. На жаль, аднак, да нашых дзён не захавалася ніводнай такой інструкцыі, хаця вядома, што на сойміках у траўні 1569 г. яны складаліся[22]. Галоўныя прынцыпы аб’яднання дзвюх дзяржаў вызначыў акт Люблінскай уніі, зацверджаны 1 ліпеня 1569 г. дэлегацыямі Кароны і Вялікага Княства[23]. Акрамя таго, унійны прывілей дае магчымасць вывучаць персанальны склад прадстаўніцтва ВКЛ на сойме ў Любліне ўлетку 1569 г.[24] У час сойма кароль і вялікі князь Жыгімонт Аўгуст

ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI–XVIII ст. // Герольд-Litherland. № 3–4 (3). Год I. Горадня, 2001. С. 85–102; Zakrzewski A. Czy w Wielkim Księstwie Litewskim XVI–XVIII wieku istniała demokracja szlachecka? // Silva rerum nova: Штудыі ў гонар 70-годдзя Георгія Я. Галенчанкі / Уклад. А. Дзярновіч, А. Семянчук; Рэд. калегія: А. Дзярновіч (адказны сакратар). Вільня-Мінск, 2009. С. 122–127.

[21] Любавский М.К. Литовско-русский сейм. Приложения. С. 215–225; Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика / Liet. istorijos inst. Kn. 532: 1569–1571. Vilnius, 2001. P. 30–37.

[22] Напр., паслы Вількамірскага павета атрымалі ад мясцовай шляхты «*инъструкъцыю под ихъ печатьми*»: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (НГАБ). Ф. КМФ–18. Воп. 1. Спр. 269. Арк. 66.

[23] Akta unii Polski z Litwą 1385–1791 / Wyd. S. Kutrzeba i W. Semkowicz. Kraków, 1932. S. 331–347, 348–362; Volumina Constitutionum. T. II (1550–1609), vol. 1 (1550–1585) / Do druku przygotowali S. Grodziski, I. Dwornicka i W. Uruszczak. Warszawa, 2005. S. 232–238.

[24] Akta unii Polski z Litwą 1385–1791. S. 348–356. З некаторымі недакладнасцямі і памылкамі ў прозвішчах гл. таксама ў: Litwa z Koroną / Oprac. wg. ostatnich źródeł E. Jezierski. Warszawa–Kraków, 1919. S. 219–222.

выдаў цэлы шэраг разнастайных нарматыўных актаў (як правіла, гаспадарскія «*листы*»), якія захаваліся ў складзе кніг Метрыкі ВКЛ[25]. Дадзеныя дакументы дазваляюць прасачыць працэс прыняцця рашэнняў, механізм увядзення ў жыццё соймавых пастаноў і, у пэўнай ступені, размежаванне ўладных паўнамоцтваў паміж каралём і соймам. Асобна адзначым гаспадарскія прывілеі 19 і 29 ліпеня 1569 г., якія датычылі самых вострых пытанняў двухбаковых адносінаў паміж Каронай і Вялікім Княствам, што паўсталі ў час заключэння Люблінскай уніі[26]. Некаторыя рашэнні, прынятыя на сойме ў Любліне, былі замацаваны ў *«Пацвярджэнні уніі паміж народам польскім і літоўскім»* — прывілеі Жыгімонта Аўгуста, выдадзеным 11 жніўня 1569 г.[27] Важнейшыя вынікі працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай утрымліваюцца ўласна ў соймавых ухвалах: канстытуцыях і падатковым універсале, зацверджаных таксама 11 жніўня 1569 г. На сойме ў Любліне было прынята 88 канстытуцый, 9 з якіх датычылі спраў выключна ВКЛ[28]. У падатковым універсале, у сваю чаргу, пералічваліся віды і нормы ўхваленых падаткаў, вызначаўся парадак іх збору[29]. Надзвычай важнае значэнне для вывучэння дзейнасці велікакняжацкай дэлегацыі на Люблінскім сойме, а менавіта для вызначэння тых агульнадзяржаўных і мясцовых праблем, якія найбольш хвалявалі шляхецкае грамадства Вялікага Княства, мае «*Отказъ от господара короля его милости и великого князя Жикгимонта Августа на прозбы княжатъ, панятъ, врядниковъ земскихъ, дворныхъ и пословъ земскихъ*»[30]. Гэты дакумент, выдадзены ў Любліне

[25] Пералік выкарыстаных у працы кніг Метрыкі ВКЛ, як надрукаваных, так і рукапісных, гл. у спісе крыніц і літаратуры.

[26] Akta unii Polski z Litwą 1385–1791. S. 376–378, 378–380; Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 242; Zbiór pamiętników do dziejów polskich: W 4 t. / Wyd. W. de Broel-Plater. T. 2. Warszawa, 1858. S. 17–18.

[27] Akta unii Polski z Litwą 1385–1791. S. 380–381; Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 243–244.

[28] Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 245–256. У склад канстытуцый быў уключаны і соймавы рэцэс (арт. 88), у якім шэраг спраў пераносіўся на разгляд наступнага вальнага сойма.

[29] Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 256–263. Варыянт падатковага ўніверсала Люблінскага сойма 1569 г., напісаны на старабеларускай мове, надрукаваны ў: Документы Московского архива Министерства юстиции (ДМАМЮ). Т. 1. Москва, 1897. С. 502–505; Русская историческая библиотека (РИБ): В 39 т. Т. 30: Литовская Метрика. Отдел первый–второй. Ч. 3: Книги публичных дел / Ред. И.И. Лаппо. Юрьев, 1914. Стб. 531–538.

[30] ДМАМЮ. С. 497–502; РИБ. Т. 30. Стб. 518–531. Падобны «*Адказ*» ад Жыгімонта Аўгуста на свае просьбы атрымаў 20 лютага 1569 г. і першы склад дэле-

12 жніўня 1569 г., з'яўляецца афіцыйным адказам Жыгімонта Аўгуста на разнастайныя просьбы, прадстаўленыя яму на сойме ад імя ўсёй дэлегацыі ВКЛ. Па сваёй форме «*Адказ*» па сутнасці адпавядаў традыцыі заканадаўчай дзейнасці вальных соймаў Вялікага Княства Літоўскага[31]. Падкрэслім таксама, што просьбы, пададзеныя каралю і вялікаму князю на сойме, фармуляваліся, хутчэй за ўсё, на аснове пасольскіх інструкцый з розных рэгіёнаў ВКЛ[32]. Адпаведна, аналіз «*Адказу*» ў пэўнай ступені дазваляе адлюстраваць змест наказаў паслам, сфармуляваных шляхтай на перадсоймавых сойміках Вялікага Княства ў траўні 1569 г.

Звесткі дакументальных крыніц разглядаюцца ў непарыўнай сувязі з тымі дадзенымі, што даюць наратыўныя крыніцы. Важнейшымі такімі крыніцамі для нашага даследавання з'яўляюцца два дзённікі (дыярыушы) Люблінскага сойма 1569 г. Першы звод соймавага дзённіка выдаў у 1856 г. польскі грамадска-палітычны дзеяч і выдавец Адам Тытус Дзялыньскі[33], другі ў 1869 г. — расійскі гісторык і грамадскі дзеяч Міхаіл Каяловіч[34]. Абодва дзённікі складаліся непасрэднымі назіральнікамі сойма ў Любліне, чым і абумоўлена вельмі падрабязнае апісанне соймавай працы, дыскусій, канфліктаў ды ініцыятываў, якія паўставалі ў час пасяджэнняў. Аднак паколькі аўтарамі занатовак былі абывацелі Кароны[35], то адчуваецца пэўны недахоп звестак аб дзейнасці прадстаўнікоў менавіта Вялікага Княства. Тым не менш, дзённікі з'яўляюцца адной з самых падставовых крыніц для вывучэння дзейнасці сенатараў і земскіх паслоў ВКЛ на Люблінскім сойме ўлетку 1569 г.

гацыі ВКЛ на Люблінскім сойме: Jaroszewicz J. Obraz Litwy pod względem jej cywilizacji, od czasów najdawniejszych do końca wieku XVIII. Cz. II. Wilno, 1844. S. 186–192.

[31] Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 43. Дарэчы, гэты дакумент дазволіў М. Доўнар-Запольскаму ўвогуле выказаць меркаванне аб асобным сойме ВКЛ, які праходзіў у Любліне ў 1569 г. паралельна з агульным соймам Кароны і Вялікага Княства: ДМАМЮ. С. 497; Доўнар-Запольскі М.В. Дзяржаўная гаспадарка… С. 178. На нашу думку, пасля 1 ліпеня 1569 г. можна казаць толькі пра нейкія асобныя нарады, сесіі прадстаўнікоў ВКЛ, але не пра асобны сойм. Гл. таксама: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 846.

[32] Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 846.

[33] Źródłopiśma do dziejów unii Korony Polskiej i Wielkiego Księstwa Litewskiego. Cz. III. Diariusz sejmu lubelskiego. Rok 1569 / Wyd. A.T. Działyński. Poznań, 1856. Апісанне падзей на сойме з 2 ліпеня па 12 жніўня 1569 г. змешчана на старонках 200–256.

[34] Дневник Люблинского сейма 1569 года: Соединение Великого Княжества Литовского с Королевством Польским / Изд. М. Коялович. СПб., 1869. Апісанне соймавых пасяджэнняў 2 ліпеня — 12 жніўня 1569 г. знаходзіцца на старонках 490–636.

[35] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. XV.

Звернем яшчэ ўвагу, што ў выданні М. Каяловіча паралельна змешчаны арыгінальны польскамоўны тэкст і яго пераклад на расійскую мову, а таксама ў падрадковых заўвагах прыведзены ўсе разначытанні з дыярыушам, надрукаваным А.Т. Дзялыньскім. Сярод наратыўных крыніц асобна можна вылучыць эпісталярныя крыніцы. Важную інфармацыю аб умовах, у якіх прыходзілася дзейнічаць прадстаўніцтву ВКЛ на сойме ў Любліне ў ліпені–жніўні 1569 г. нясуць лісты да віленскага ваяводы, канцлера Мікалая Радзівіла Рудога ад жамойцкага старосты, земскага маршалка Яна Хадкевіча і земскага падскарбія Мікалая Нарушэвіча[36], троцкага кашталяна, падканцлера Астафея Валовіча[37], пісара ВКЛ Мацея Савіцкага[38], а таксама карэспандэнцыя Радзівілаў[39] і Сангушкаў[40]. Прыватныя лісты часта ўтрымліваюць неафіцыйныя звесткі, якія далёка незаўсёды можна сустрэць у дакументальных крыніцах. А гэта, у сваю чаргу, дае магчымасць выявіць сапраўдныя мэты і інтарэсы велікакняжацкіх прадстаўнікоў, іх рэальнае стаўленне да тых ці іншых праблемаў тагачаснага сацыяльна-палітычнага жыцця. Дадатковую, часам ускосную, інфармацыю аб палітычнай пазіцыі вышэйшых кіроўных колаў Вялікага Княства па некаторых пытаннях, што абмяркоўваліся на Люблінскім сойме 1569 г., можна атрымаць з ліставання паміж Жыгімонтам Аўгустам і М. Радзівілам Рудым за 1568–1570 гг.[41]

Дададзім, што ўсебаковы аналіз асабовага складу дэлегацыі ВКЛ на Люблінскім сойме ў ліпені–жніўні 1569 г. таксама вымагаў выкарыстання разнастайных матэрыялаў. Так, для вызначэння сацыяльнага і маёмаснага стану шляхты ў другой палове XVI ст. важнае значэнне маюць звесткі перапісаў (попісаў) войска ВКЛ 1565 і 1567 гг.[42] Значна палягчаюць вывучэнне шля-

[36] Археографический сборник документов (АСД), относящихся к истории Северо-Западной России, издаваемый при управлении Виленского учебного округа: В 14 т. Т. 7 (1433–1791). Вильна, 1870. С. 38–49.

[37] Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie (AGAD). Archiwum Radziwiłłów (AR). Dz. V. Nr. 17959/I. S. 81–100, 105–108.

[38] AGAD. AR. Dz. V. Nr. 13980. S. 29–75.

[39] Kempa T. Listy Radziwiłłów z okresu Unii Lubelskiej (1568–1569) // Zapiski Historyczne. T. 69. 2004, z. 4. S. 87–109.

[40] Archiwum książąt Sanguszków w Sławucie. T. 7: 1554–1572. Lwów, 1910.

[41] AGAD. AR. Dz. II. Nr. 62. S. 1–8; Nr. 63. S. 1–10; Listy króla Zygmunta Augusta do Radziwiłłów / Oprac. I. Kaniewska. Kraków, 1999.

[42] РИБ. Т. 33: Литовская Метрика. Отдел третий. Ч. 3: Книги публичных дел. Переписи Литовского войска / Ред. С.Л. Пташицкий. Петроград, 1915. Стб. 237–430, 431–1378.

хоў палітычнай кар’еры сенатараў і земскіх паслоў спісы ўраднікаў Вялікага Княства. На дадзены момант ужо існуе дакладны і падрабязны пералік цэнтральных (земскіх) і прыдворных (дворных) ураднікаў[43], а таксама ідзе праца па падрыхтоўцы да друку спісаў ваяводскіх і павятовых ураднікаў ВКЛ[44]. Для вызначэння этнічнага паходжання велікакняжацкіх прадстаўнікоў на Люблінскім сойме 1569 г. мы карысталіся перш за ўсё генеалагічнымі[45], а таксама антрапанімічнымі звесткамі. Цікавай, але не зусім дакладнай, крыніцай па канфесійнай прыналежнасці вышэйшых кіроўных колаў Вялікага Княства з’яўляецца створаны ў 1569 г. пералік сенатараў Рэчы Паспалітай паводле іх веравызнання[46]. Безумоўна, значная колькасць персанальных звестак аб велікакняжацкіх сенатарах і земскіх паслах, іх грамадскай дзейнасці, этапах кар’еры, маёмасным становішчы, сваяцкіх і кліентальных сувязях утрымліваецца ў матэрыялах Метрыкі ВКЛ.

Неабходна таксама асобна агаварыць і значэнне некаторых тэрмінаў, якія выкарыстоўваюцца ў нашай працы. Так, у адносінах да сацыяльна-палітычных рэаліяў Вялікага Княства Літоўскага XVI ст. пад тэрмінам «*палітычны народ*» разумеем тую частку шляхецкага стану ВКЛ, якая актыўна карысталася пра-

[43] Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII–XVIII wieku: Spisy / Pod red. A. Gąsiarowskiego. T. 11: Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy / Oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba. Kórnik, 1994; Wolff J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego (1386–1795). Kraków, 1885.

[44] Ужо выдадзены: Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy. T. 1: Województwo Wileńskie XIV–XVIII wiek / Pod red. A. Rachuby. Warszawa, 2004; T. 2: Województwo Trockie XIV–XVIII wiek / Pod red. A. Rachuby. Warszawa, 2009; T. 3: Księstwo Żmudzkie XV–XVIII wiek / Pod red. A. Rachuby. Warszawa, 2015; T. 4: Ziemia smoleńska i województwo smoleńskie XIV–XVIII wiek / pod red. A. Rachuby. Warszawa, 2003. Акрамя таго, выданне спісаў павятовых ураднікаў ВКЛ другой паловы XVI – першай паловы XVII ст. ажыццяўляецца беларускімі (Віталь Галубовіч, Андрэй Радаман) і літоўскімі (Дарыюс Вілімас) гісторыкамі. Намі былі выкарыстаны наступныя падрыхтаваныя імі спісы: Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Віцебскага ваяводства (другая палова XVI – першая палова XVII стст.) // Полацкія гістарычныя запіскі. Т. 2. 2005. С. 51–61; Яны ж. Земскія ўраднікі Менскага павета ў другой палове XVI–першай палове XVII стст. // Тамсама. Т. 3. 2006. С. 65–69.

[45] Гл. напр.: Niesiecki K. Herbarz Polski / Wyd. J. Bobrowicz. T. 1–10. Lipsk, 1839–1846; Poczet rodów w Wielkim Księstwie Litewskim w XV i XVI wieku / Ułożył i wydał A. Boniecki. Warszawa, 1887; Złota księga szlachty polskiej / Przez T. Żychlińskiego. R. I–XXXI. Poznań, 1879–1908.

[46] Dyaryusze sejmów Koronnych 1548, 1553 i 1570 r. / Wyd. J. Szujski. Kraków, 1872. S. 154.

вам удзельнічаць у палітычным жыцці на ўсіх яго ўзроўнях[47]. У сваю чаргу, паняцце «*палітычная эліта*» азначае групу асобаў, якія займалі вышэйшыя дзяржаўныя ўрады і/або мелі высокі сацыяльны статус, валодалі аўтарытэтам (прэстыжам) у грамадстве, у той ці іншай ступені ўдзельнічалі ў прыняцці рашэнняў у агульнадзяржаўным маштабе. Фармальна, перад заключэннем Люблінскай уніі 1569 г. палітычная эліта ВКЛ адпавядала панам-радзе ў шырокім складзе. Заўважым, што паняцці «палітычная эліта» і «кіроўныя колы» ВКЛ у дадзенай працы ўжываюцца як сінонімы. Больш вузкае значэнне мае тэрмін «*уладная эліта*». Да яе залічваем толькі тую частку палітычнай эліты, якая разам з вялікім князем літоўскім рэальна брала ўдзел у вызначэнні дзяржаўнай палітыкі і непасрэдна ўплывала на працэс прыняцця важнейшых рашэнняў па розных праблемах жыцця краіны[48]. У цэлым, для XVI ст. уладную эліту можна атаесамляць з такой палітычнай структурай, як т.зв. «пярэдняя лавіца» паноў-рады ВКЛ («пярэдняя рада»)[49]. Таксама адзначым, што пры разглядзе грамадскага жыцця на ўзроўні нейкага павета можна казаць пра лакальную (мясцовую) эліту. Да «*лакальнай палітычнай эліты*» адносім групу людзей, якія валодалі рэальнай уладай і аўтарытэтам у сваім павеце, актыўна ўдзельнічалі ў грамадска-палітычным жыцці, у тым ліку ў вырашэнні мясцовых праблем, як на лакальным, так і на агульнадзяржаўным узроўні[50].

[47] Bardach J. Naród polityczny i jego przemiany (1493–1993) // Społeczeństwo obywatelskie i jego reprezentacja (1493–1993). S. 9–12, 17; Russocki S. Monarchie stanowe Środkowo-Wschodniej Europy XV–XVI wieku // Kwartalnik Historyczny. 1977. R. 84, № 1. S. 73–92; Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego w Wielkim Księstwie Litewskim późnego średniowiecza // Zapiski Historyczne. T. 48. 1983, z. 1–2. S. 31–34. Падобнага падыходу прытрымліваецца і літоўская даследчыца Юратэ Кяўпене, якая да палітычнага народа адносіць «палітычна паўнапраўных прадстаўнікоў грамадства Вялікага Княства Літоўскага»: Кяупене Ю. Особенности политической культуры Великого княжества Литовского в XVI в. // Балты и Великое княжество Литовское. Историко-лингвистический взгляд. Памяти Эгидиюса Банёниса. М., 2007. С. 57.

[48] Аб падыходах да вызначэння тэрмінаў «палітычная эліта» і «ўладная эліта» ў сусветнай навуцы гл. напр.: Nocoń J. Elity polityczne. Studium interpretacji funkcjonalnej. Toruń, 2004; Żyromski M. Teorie elit a systemy polityczne / Uniwersytet im. Adama Mickiewicza w Poznaniu. Seria nauki polityczne, nr. 21. Poznań, 2007.

[49] Аб складзе паноў-рады ВКЛ у XVI ст. гл. напр.: Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 331–347; Zakrzewski A. Wielkie Księstwo Litewskie (XVI–XVIII w.). S. 89–90.

[50] Напр., для 1560–1570-х гг. да палітычнай эліты павета магчыма аднесці павятовых ураднікаў, членаў земскага і гродскага суда, палітычных актывістаў, якія

Нарэшце, хацелася б з асаблівай удзячнасцю згадаць свайго навуковага настаўніка Паўла Алегавіча Лойку, які, на жаль, так заўчасна пакінуў гэты свет. Менавіта ён пазнаёміў мяне, тады яшчэ студэнта першага курса гістарычнага факультэта БДУ, з такой надзвычай цікавай і адметнай крыніцай — дзённікам Люблінскага сойма 1569 г. Па вялікім рахунку, з той студэнцкай зацікаўленасці і нарадзілася дадзенае даследаванне. Таксама выказваю шчырую падзяку навуковаму рэдактару гэтага выдання Андрэю Радаману за слушныя заўвагі і карысныя парады. Акрамя таго, лічу неабходным падзякаваць сваім сябрам і калегам, змястоўнае навуковае супрацоўніцтва з якімі непасрэдна паўплывала на напісанне нашай працы: Р. Аляхновіч, Ю. Бохану, Г. Брэгеру, В. Галубовічу, К. Жойдзю, А. Закшэўскаму, Т. Кэмпе, А. Любай, А. Любаму, С. Салею, А. Чволэку, А. Шаландзе, А. Янушкевічу.

ўдзельнічалі ў працы соймікаў, абіраліся пасламі на соймы і з'езды (пазней — яшчэ і дэпутатамі Трыбунала ВКЛ), прызначаліся мясцовымі зборшчыкамі падаткаў (паборцамі): Падалінскі У. Палітычная эліта Лідскага павета ў апошняй трэці XVI ст. // Беларускі гістарычны агляд. Т. 16, сш. 1 (30). 2009. С. 3. У адносінах да асобных гістарычных рэгіёнаў ВКЛ (напр., Жамойцкае староства, Полацкае і Віцебскае ваяводствы) магчыма весці гаворку пра рэгіянальную палітычную эліту.

# ЧАСТКА 1

# ДЗЕЙНАСЦЬ ДЭЛЕГАЦЫІ ВКЛ НА ЛЮБЛІНСКІМ СОЙМЕ (2 ЛІПЕНЯ – 12 ЖНІЎНЯ 1569 Г.)

1 ліпеня 1569 г. паны-рада і земскія паслы Кароны Польскай і Вялікага Княства Літоўскага сваёй прысягай зацвердзілі дагавор аб уніі паміж дзвюма дзяржавамі[1]. І ўжо на наступны дзень, у суботу 2 ліпеня, распачалося першае пасяджэнне супольнага вальнага сойма Рэчы Паспалітай. Ад імя караля і вялікага князя Жыгімонта Аўгуста каронны канцлер Валянцін Дэмбіньскі (Walenty Dembiński) перад прысутнымі сенатарамі і пасламі агучыў прапазіцыю «*ўжо ўсёй радзе супольнай, як кароннай, так і літоўскай*»[2]. Сенатарам неабходна было выказацца па тых пытаннях, вырашэнне якіх было перанесена на агульныя нарады ўжо пасля заключэння уніі. Частка з гэтых пытанняў агучвалася яшчэ ў першай прапазіцыі ў пачатку Люблінскага сойма, частка — з'яўлялася артыкуламі, якія дэлегацыя ВКЛ у чэрвені 1569 г. імкнулася ўключыць ва унійны прывілей. Такім чынам, на разгляд сойма выносіліся праблемы арганізацыі абароны краіны; біцця

[1] Akta unii Polski z Litwą 1385–1791. S. 331–363; Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 232–238. 1 ліпеня прынясенне прысягі зацягнулася да восьмай гадзіны вечара: Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 485–490. Гл. таксама: Źródłopiśma do dziejów unii. S. 198–200. 4 ліпеня 1569 г. Жыгімонт Аўгуст выдаў аналагічны прывілей, якім зацвердзіў унію паміж ВКЛ і Польшчай: Akta unii Polski z Litwą 1385–1791. S. 364–373.

[2] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 491. Акрамя таго, з ранку 2 ліпеня яшчэ прыносілі прысягу на акт уніі тыя, хто не паспеў прысягнуць у папярэдні дзень, у прыватнасці брацлаўскі ваявода і выконваючы абавязкі дворнага гетмана ВКЛ Раман Сангушка: Там же. С. 490.

новай аднастайнай манеты; вызначэння статусу Інфлянтаў; вядзення перамоў з Маскоўскай дзяржавай; размежавання кампетэнцыі ўрадаў Вялікага Княства і Кароны; вызначэння месца правядзення вальных соймаў; усталявання парадку і месца выбараў караля і вялікага князя; фінансавага забеспячэння каралеўскіх нашчадкаў і вызначэння месца прадстаўнікоў княжацкіх родаў у супольным сенаце. Неабходна было абмеркаваць і некаторыя іншыя пытанні, яшчэ раней узнятыя каронным паслам (напрыклад, аб умовах збору і расходавання «кварты» — чацвёртай, а з 1567 г. — пятай, часткі даходаў з дзяржаўных уладанняў Кароны Польскай)[3]. Акрамя гэтага, дэлегацыя ВКЛ пад час соймавых пасяджэнняў уздымала іншыя актуальныя для сябе праблемы, а земскія паслы выступалі з цэлым шэрагам мясцовых і прыватных пастулатаў. Таму можна вызначыць тры галоўныя накірункі дзейнасці прадстаўніцтва Вялікага Княства на сойме ў Любліне ўлетку 1569 г.: вызначэнне дзяржаўна-прававога статусу ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай, забеспячэнне сумеснай абароны краіны і вырашэнне мясцовых ды персанальных спраў.

## ГЛАВА 1

## ВЫЗНАЧЭННЕ ДЗЯРЖАЎНА-ПРАВАВОГА СТАТУСУ ВКЛ У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Паводле акта Люблінскай уніі 1569 г. Вялікае Княства Літоўскае і Карона Польская станавіліся «*адным непадзельным і неадрозным целам, а таксама не рознай, але адной супольнай Рэч Паспалітай, якая з дзвюх дзяржаў і нацый у адзін народ злучылася і знітавалася*»[4]. Праўда, гэтыя словы хутчэй акрэслівалі мэту аб'яднання,

[3] АСД. Т. 7. С. 46; Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 491–492; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 200. Гл. таксама: Лаппо И.И. Великое княжество Литовское от заключения Люблинской унии... С. 62; Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 838; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 41. Аб ухваленні і арганізацыі выплаты кварты гл. напр.: Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej 1587–1648. Projekty-ustawy-realizacja. Warszawa, 2006. S. 14–22; Sucheni-Grabowska A. Walka o wymiar i przeznaczenie kwarty w końcu XVI i na początku XVII wieku // Przegląd Historyczny. 1965. T. 56, z. 1. S. 24–45.

[4] Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 235. У дадзеным выпадку пад тэрмінам «нацыя» (лац. — *natio*, поль. — *naród*) меліся на ўвазе ўсе паўнапраўныя абывацелі Вялікага Княства і Кароны незалежна ад іх этнічнай прыналежнасці. Гл. напр.: Бардах Ю. Ад палітычных да этнічных народаў у Цэнтральна-Ўсходняй

а не з'яўляліся адлюстраваннем рэальнага стану рэчаў. Рэч Паспалітая паўстала на федэратыўнай аснове[5] і да уніфікацыі дзяржаўна-прававых адметнасцяў, якія на той момант захоўваліся ў абодвух яе суб'ектах, магла прывесці толькі далейшая практыка сумеснага сацыяльна-палітычнага жыцця. Утварэнне Рэчы Паспалітай абумовіла з'яўленне агульных для Кароны і Вялікага Княства ўладных інстытутаў і сфер грамадскіх адносін. Адпаведна, паўставала неабходнасць дакладнага вызначэння прынцыпаў працы супольнага вальнага сойма, размежавання паўнамоцтваў цэнтральных і прыдворных урадаў, збліжэння сістэм заканадаўства суб'ектаў новага дзяржаўнага аб'яднання, уніфікацыі іх манетных сістэм. Важнае значэнне мела ўдакладненне прававога статусу тых зямель, якія знаходзіліся ў рознай ступені залежнасці ад Кароны і Вялікага Княства (Прускае герцагства, Інфлянты ў шырокім сэнсе, г.зн. герцагства Курляндскае і Земгальскае ды Задзвінскае княства), а таксама ўрэгуляванне тэрытарыяльных спрэчак уласна паміж Польшчай і ВКЛ.

Акт уніі прадугледжваў утварэнне ў Рэчы Паспалітай агульнага вальнага сойма, па сутнасці цэнтральнага элемента яе палітычнай сістэмы, у якім павінны былі засядаць сенатары і земскія паслы Кароны і Вялікага Княства ды разам раіцца аб супольных патрэбах[6]. Аднак ужо першы дзень працы сойма выявіў неабходнасць далейшага ўрэгулявання соймавай працэдуры, што было звязана з уключэннем у сенат і пасольскую ізбу прадстаўнікоў Вялікага Княства Літоўскага. Так, у 1569 г. у склад ніжняй палаты сойма Рэчы Паспалітай побач са 114 кароннымі пасламі ўвайшлі

Еўропе // Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Пер. М. Раманоўскага і А. Істоміна; Прадм. Г. Сагановіча. Мінск, 2002. С. 318–320, 322; Niendorf M. Wielkie Księstwo Litewskie. Studia nad kształtowaniem się narodu u progu epoki nowożytnej (1569–1795) / Przekład M. Grzywacz. Poznań, 2011. S. 7, 13, 15–16, 25 i in.

[5] У Рэчы Паспалітай меў быць адзіны манарх, а таксама супольны вальны сойм і агульная знешняя палітыка. Аднак пры гэтым ВКЛ захавала асобныя пасады, судовую і прававую сістэмы, канцылярыю, скарб, войска, тытул, сімволіку, афіцыйную старабеларускую мову (да 1697 г.), тэрытарыяльную адасобленасць. Такім чынам, і пасля заключэння Люблінскай уніі 1569 г. Вялікае Княства Літоўскае валодала частковым суверэнітэтам і яго дзяржаўнасць не была ліквідавана: Падалінскі У. Барацьба шляхты за суверэнітэт ВКЛ пасля Люблінскай уніі 1569 г. // Беларускі гістарычны часопіс. 2016. №7. С. 23–28.

[6] Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 236 (арт. 8). Ва унійным прывілеі асобна агаворвалася забарона склікаць асобныя соймы ў ВКЛ і Кароне (арт. 16). Прадугледжвалася правядзенне супольных выбараў караля і вялікага князя (фактычна, элекцыйных соймаў) на тэрыторыі Польшчы, а таксама каранацыі абранага манарха ў Кракаве (арт. 4): Ibidem. S. 235, 237.

44 земскія паслы ад 22 соймікавых акругаў ВКЛ[7]. Разам з тым, не быў вызначаны парадак, у якім павінны засядаць і, адпаведна, выступаць паслы Кароны і Вялікага Княства. І ўжо 2 ліпеня пасольская ізба не змагла прыступіць да працы з-за спрэчкі паміж пасламі Сандамірскага, Калішскага і Троцкага ваяводстваў аб парадку іх засядання ў палацы[8]. У панядзелак, 4 ліпеня, з мэтай вырашыць гэты канфлікт да земскіх паслоў прыйшлі вялікі каронны маршалак Ян Фірлей (Jan Firlej) і сандамірскі ваявода Пётр Збароўскі (Piotr Zborowski). У выніку, каб ніжняя палата сойма ўсё ж змагла распачаць працу, каронны маршалак асабіста мусіў расстаўляць лавы і вызначаць для прадстаўнікоў кожнага ваяводства месцы, на якіх яны павінны былі засядаць[9]. Аднак гэта было толькі часовае выйсце. Тым больш, што распачаўся яшчэ канфлікт паміж пасламі Кракаўскага, Познаньскага і Сандамірскага ваяводстваў аб месцы ў пасольскай ізбе паслоў Віленскага ваяводства. На пасяджэнні 6 ліпеня гэтая спрэчка разгарэлася ўжо ў прысутнасці Жыгімонта Аўгуста. У выніку, кароль і вялікі князь пастанавіў, што прадстаўнікі Віленскага ваяводства будуць засядаць пасля паслоў Познаньскага ваяводства[10]. Верагодна, менавіта тады і быў выдадзены адпаведны каралеўскі ліст, які канчаткова вызначыў парадак засядання ў пасольскай ізбе земскіх прадстаўнікоў Вялікага Княства і Кароны[11]. Гэты парадак з невялікімі зменамі праіснаваў фактычна да канца XVIII ст.

[7] Паводле Статута ВКЛ 1566 г. шляхта абірала на сойм «*отъ кождого суду земского … по две особы*»: Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / Рэдкалегія Т.І. Доўнар і інш. Мінск, 2003. С. 79–80 (раздзел 3, артыкул 5). З улікам яшчэ прыкладна 10 паслоў ад Прусіі, колькасць якіх не была пастаяннай і магла змяняцца, пасольская ізба ў 1569 г. налічвала каля 168 дэпутатаў, г.зн. паслы ВКЛ складалі недзе 26,2% ад усіх земскіх прадстаўнікоў Рэчы Паспалітай: Historia sejmu polskiego: W 3 t. / Pod red. J. Michalskiego. T.1: Do schyłku szlacheckiej Rzeczypospolitej. Warszawa, 1984. S. 174–175; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 23. Звыш таго, у працы заключнага этапа Люблінскага сойма ўдзельнічалі яшчэ 2 паслы ад Смаленскага ваяводства. Аб асаблівасцях іх абрання і ролі на сойме гаворка пойдзе ніжэй (*гл. главу 2.2*).

[8] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 502.

[9] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 502. Пры гэтым, аўтар соймавага дзённіка адзначыў даволі высокі накал эмоцый паміж пасламі ў час гэтых спрэчак.

[10] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 507. Гл. таксама: Лаппо И.И. Великое княжество Литовское от заключения Люблинской унии… С. 63.

[11] Тэкст ліста на дадзены момант невядомы, але ў каралеўскім прывілеі ад 11 жніўня 1569 г., а таксама ў соймавых канстытуцыях адзначана, што на сойме былі вызначаны месцы «*паслам земскім ваяводстваў літоўскіх паміж ваяводстваў каронных, якія так ужо назаўсёды павінны застацца, як гэта* ***лістом***

Магчыма, пасля 4 ліпеня 1569 г. быў зацверджаны соймам і «*Парадак Рады кароннай, Польскай і Літоўскай*...», які вызначыў іерархію сенатарскіх урадаў у Рэчы Паспалітай[12]. Аднак само рашэнне аб месцы сенатараў Кароны і Вялікага Княства ў агульным сенаце было прынята, хіба, яшчэ да заключэння Люблінскай уніі. Прынамсі, ужо пад час вотумаў (прамоў) па прапазіцыі 2 ліпеня сенатары выступалі менавіта ў той паслядоўнасці, якая была замацавана ў згаданым «*Парадку Рады*...»[13]. Такім чынам, са 140 сенатараў Рэчы Паспалітай толькі 27 (19,3%) прадстаўлялі ВКЛ[14]. Выдадзенае Жыгімонтам Аўгустам 11 жніўня 1569 г. *«Пацвярджэнне уніі паміж народам польскім і літоўскім»* і канстытуцыі Люблінскага сойма (арт. 4) яшчэ раз зацвердзілі рашэнні аб парадку засядання на сойме сенатараў у «*адзіным і супольным*» сенаце, а таксама земскіх паслоў у пасольскай ізбе[15]. У колькасным складзе на сойме каронныя сенатары і паслы мелі значную перавагу над велікакняжацкімі прадстаўнікамі. Аднак варта памятаць, што ў часы панавання Жыгімонта Аўгуста, асабліва ў 1560-я гг., усталявалася практыка зацвярджэння соймавых рашэнняў шляхам дасягнення *згоды* паміж каралём, сенатам і пасольскай ізбой. Дасягнута падобная згода магла быць толькі пры ўмове падтрымкі той ці іншай ухвалы большасцю ўдзельнікаў сойма, без рашучага пярэчання з боку яе праціўнікаў (*nemine contradicente*)[16].

***Нашым асобным*** *(вылучана намі — У.П.) апісана*»: Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 243–244, 246. Іерархія ваяводстваў Рэчы Паспалітай у складзе пасольскай ізбы ўказана таксама ў падатковым універсале, ухваленым на сойме 11 жніўня 1569 г.: Ibidem. S. 262.

[12] Akta unii Polski z Litwą 1385–1791. S. 373–375; Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. Warszawa, 2005. S. 239–241; Wisner H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita. Szkice z czasów Zygmunta III i Władysława IV Wazy. Wyd. II. Warszawa, 2001. S. 22.

[13] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 492–501; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 200–205. Яшчэ каронны сойм 1563–1564 гг. у Варшаве ўзняў пытанне аб парадку месцаў у аб'яднаных сенаце і пасольскай ізбе, але адклаў яго на разгляд супольнага сойма Кароны і Вялікага Княства: Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 131.

[14] Historia sejmu polskiego. T.1. S. 170–171; Kutrzeba S. Sejm walny dawnej Rzeczypospolitej. Warszawa, 1919. S. 75–77; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 23.

[15] Akta unii Polski z Litwą 1385–1791. S. 380–381; Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 243–244, 246. Гл. таксама: Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S . 43.

[16] Historia sejmu polskiego. T.1. S. 192–200; Sucheni-Grabowska A. W sprawie podejmowania uchwał na sejmach za Zygmunta Augusta // Uchwalanie konstytucji na sejmach w XVI–XVIII w. / Acta Universitatis Wratislaviensis. Nr. 477. Historia XXXI. Studia z dziejów Rzeczypospolitej szlacheckiej. Wrocław, 1979. S. 9–19; Zakrzewski A. Wielkie Księstwo Litewskie (XVI–XVIII w.). S. 95. Падкрэслім, што ў XVI ст. не існавала прававых нормаў, якія б дакладна вызначалі прынцыпы галасавання

У такой сітуацыі колькасная перавага каронных прадстаўнікоў не мела вызначальнага значэння, а дэлегацыя ВКЛ заўсёды мела магчымасць заблакіраваць прыняцце якіх-небудзь некарысных для сябе пастаноў, тым больш, калі ўхвала магла датычыць непасрэдна або выключна спраў Вялікага Княства Літоўскага.

Затое вызначэнне асабовага складу сената Рэчы Паспалітай стала балючым ударам па сацыяльным статусе часткі палітычнай эліты ВКЛ. У супольным сенаце былі прадстаўлены толькі тыя ўрады Вялікага Княства, якія мелі непасрэдныя адпаведнікі ў Кароне: каталіцкія біскупы, ваяводы (у тым ліку жамойцкі староста), кашталяны, земскі маршалак, канцлер, падканцлер, земскі падскарбі і дворны маршалак. Па сутнасці, вальны сойм Рэчы Паспалітай з'яўляўся трансфармацыяй сойма Кароны Польскай за кошт уключэння ў яго склад адпаведных прадстаўнікоў Вялікага Княства Літоўскага[17]. У выніку, зусім не былі ўлічаны асаблівасці даволі стракатага сацыяльнага складу вышэйшых колаў велікакняжацкага шляхецкага грамадства. Па-за межамі сената аказаўся шэраг дворных ураднікаў (напрыклад, дворны падскарбі, падчашы, крайчы, стольнік і інш.), гаспадарскія маршалкі, якія раней уваходзілі ў склад паноў-рады ВКЛ. Не атрымалі месца ў сенаце і нашчадкі вялікага князя Альгерда слуцкія князі Алелькавічы. Таксама перасталі запрашацца на сойм і прадстаўнікі княжацкіх і панскіх родаў Вялікага Княства[18]. Не будзем забывацца і на тое, што напярэдадні Люблінскай уніі ад ВКЛ былі адарваны адразу 4 ваяводствы: Кіеўскае, Валынскае, Падляшскае і Брацлаўскае. Праўда, у супольным сенаце з'явіліся пасады смаленскіх ваяводы

і прыняцця рашэнняў на соймах Польшчы або ВКЛ. Важнейшае значэнне мелі склаўшаяся традыцыя соймавай працы і палітычная сітуацыя ў кожны канкрэтны момант часу.

[17] Пра гэта даволі выразна сведчыць тое, што ў акце уніі сойм Рэчы Паспалітай называўся «*супольным каронным*». Акрамя таго, у гаспадарскім прывілеі ад 19 ліпеня 1569 г. сцвярджалася, што ў выніку уніі ў Вялікага Княства Літоўскага «*соймы адняты і сюды ў Польшчу перанесены*»: Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 236, 242. Гл. таксама: Kutrzeba S. Skład Sejmu polskiego. 1493–1793 // Przegląd Historyczny. 1906. T. 2, z. 1. S. 63–65.

[18] Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 840–841; Пичета В.И. Польша на путях колонизации Украины и Белоруссии. Люблинская уния и ее политические последствия // Исторические записки. 1940. № 7. С. 71–74; Kieniewicz L. Senat za Stefana Batorego. Warszawa, 2000. S. 28–30; Rachuba A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763. Warszawa, 2002. S. 49–50, 168–169.

і кашталяна[19], нягледзячы на тое, што Смаленскае ваяводства яшчэ з пачатку XVI ст. знаходзілася ў складзе Маскоўскай дзяржавы. На нашу думку, утварэнне гэтых тытулярных урадаў, у першую чаргу, павінна было замацаваць далейшыя прэтэнзіі ўжо новаўтворанай Рэчы Паспалітай на землі Смаленшчыны. Аднак кампенсаваць страты, нанесеныя палітычнай эліце ВКЛ, падобнае рашэнне ніяк не магло. Матэрыялы працы Люблінскага сойма не адлюстроўваюць аніякіх актыўных захадаў дэлегацыі Вялікага Княства па пераглядзе рашэння аб складзе сената Рэчы Паспалітай. Хіба, адзінай спробай хоць неяк павялічыць сваё прадстаўніцтва ў вышэйшай палаце сойма была просьба, пададзеная Жыгімонту Аўгусту ад «*ихъ милости пановъ радъ, врядниковъ дворныхъ и всихъ становъ Великого князьства Литовского*» напрыканцы соймавых пасяджэнняў, аб утварэнні Гарадзенскага і Ковенскага ваяводстваў і, адпаведна, увядзенні там сенатарскіх пасадаў ваяводы і кашталяна. Аднак кароль і вялікі князь гэтую просьбу адхіліў[20].

На разгляд сойма выносілася і пытанне вызначэння месца прадстаўнікоў княжацкіх родаў ВКЛ у супольным сенаце. У першую чаргу, справа ішла аб захаванні спадчыннага месца ў сенаце для слуцкага князя Юрыя Алелькавіча[21]. Аднак далейшага развіцця гэтая справа не атрымала ні на соймавых пасяджэннях, ні ў выніковых рашэннях сойма. Магчыма, у першую чаргу, на разгляд пытання аб месцы княжацкіх родаў у складзе сената проста не хапіла часу. Хаця пэўную ролю тут адыграў і канфлікт паміж Ю. Алелькавічам і віленскім ваяводам, канцлерам ВКЛ Мікалаем Радзівілам Рудым, які цягнуўся яшчэ з пачатку 1560-х гг. Канфлікт меў выразны статусны характар: абодва магнаты дамагаліся заняць сярод радных паноў другое месца пасля віленскага біскупа, г.зн. атрымаць статус першага свец-

[19] Цікава, што Жыгімонт Аўгуст прызначыў смаленскім ваяводам Васіля Тышкевіча, а кашталянам — Рыгора Трызну, г.зн. тых, каго ён яшчэ ў траўні 1569 г. пазбавіў пасадаў падляшскіх ваяводы і кашталяна за адмову прынесці прысягу на вернасць Кароне Польскай: Halecki O. Dzieje unii jagiellońskiej. S. 305; Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy. T. 4. S. 86, 214; Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 239–240.

[20] Арт. 16: ДМАМЮ. С. 500; РИБ. Т. 30. Стб. 527. Заўважым, што просьба стварыць гэтыя новыя ўрады агучвалася яшчэ на вальным сойме ВКЛ у Гародні ў 1566/1567 г., а таксама на першым этапе сойма ў Любліне ў студзені–лютым 1569 г.: РИБ. Т. 30. Стб. 431–432; Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 770, 843; Jaroszewicz J. Obraz Litwy… S. 189.

[21] Kutrzeba S. Skład Sejmu polskiego. S. 63–69; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 41, 57–59.

кага прадстаўніка паноў-рады ВКЛ. Ю. Алелькавіч разлічваў захаваць такі ж статус і ў складзе ўжо супольнага сената. Цалкам магчыма, што прыхільнікі М. Радзівіла Рудога як у дэлегацыі Вялікага Княства, так і сярод прадстаўнікоў Кароны не дапусцілі вырашэння спрэчнага пытання на сойме ў Любліне на карысць слуцкага князя[22]. Да таго ж, і частка кароннай палітычнай эліты выступала прынцыпова супраць надання любым княжацкім родам нейкіх выключных палітычных правоў, у прыватнасці вызначэння для іх спадчыннага месца ў сенаце Рэчы Паспалітай[23].

У пэўнай ступені, захаваць ранейшы, высокі сацыяльны статус той часткі палітычнай эліты ВКЛ, якая не патрапіла ў склад аб'яднанага сената, дапамагло б захаванне асобнага сойма ў Вялікім Княстве. Аднак вялікакняжацкая дэлегацыя дабіцца гэтага не здолела: акт Люблінскай уніі абвясціў утварэнне супольнага сойма Рэчы Паспалітай і забараніў правядзенне асобных сеймаў у Кароне або Вялікім Княстве[24]. Праўда, яшчэ заставалася магчымасць дасягнуць прыняцця рашэння аб правядзенні агульных вальных сеймаў у тым ліку і на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Падчас сенатарскіх вотумаў 2 ліпеня 1569 г. жамойцкі староста, земскі маршалак ВКЛ Ян Хадкевіч выказваўся за правядзенне вальных сеймаў Рэчы Паспалітай не ў нейкім адным горадзе, а ў розных, «*паводле патрэбы*»: у Кракаве, Любліне, Варшаве, Вільні[25]. На жаль, пазіцыя іншых сенатараў, а таксама земскіх паслоў ВКЛ па гэтым пытанні дакладна не вядома. Аднак можна меркаваць, што яны ў цэлым павінны былі падтрымліваць погляд фактычнага кіраўніка дэлегацыі Вялікага Княства[26]. Дарэчы, і частка ка-

[22] Скеп'ян А.А. Князі Слуцкія. Мінск, 2013. С. 65–76, 101–108, 111, 126–127, 130–132; Kempa T. Zabiegi kniaziów Olelkowiczów słuckich o uzyskanie miejsca w senacie po 1569 roku // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. 2003. № 47. S. 69–70. Спробы дабіцца ўвядзення князёў Алелькавічаў у склад сената Рэчы Паспалітай працягваліся да пачатку 1590-х гг., г.зн. да спынення мужчынскай лініі гэтага роду.

[23] Biblioteka Kórnicka Polskiej Akademii Nauk (Kórnik). Rkps. 277. Acta oryginalne za panowania StefanaBatorego. K. 29–30v.; Kempa T. Zabiegi kniaziów Olelkowiczów... S. 83–84, 86, 88.

[24] Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 236 (арт. 8), 237 (арт. 16). Земскі падскарбі ВКЛ М. Нарушэвіч у сваім лісце да М. Радзівіла «Рудога» ад 28 ліпеня 1569 г. шкадаваў, што ў Любліне не ўдалося прынцыпова настаяць на захаванні «*свайго сойма ў Літве*». Тым больш, што «*і паны Палякі не вельмі нам таго забаранялі... Але ўжо што адбылося, тое цяжка змяніць*»: АСД. Т. 7. С. 48.

[25] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 499–500.

[26] Прынамсі ў чэрвені 1569 г., г.зн. яшчэ да заключэння Люблінскай уніі, дэлегацыя ВКЛ даволі актыўна настойвала на пачарговым правядзенні супольных вальных сеймаў у Кароне і Вялікім Княстве: АСД. Т. 7. С. 40, 46; Дневник

ронных сенатараў не выключала магчымасці правядзення соймаў на землях ВКЛ, у прыватнасці, у Берасці[27]. Яшчэ ў ліпені (напрыклад, 9 і 19 ліпеня) дапускаў магчымасць правядзення супольных соймаў Рэчы Паспалітай на тэрыторыі ВКЛ, у тым жа Берасці, і сам Жыгімонт Аўгуст[28]. Аднак у далейшым вялікакняжацкае прадстаўніцтва не праявіла настойлівасці ў вырашэнні гэтай праблемы. І ўжо напрыканцы сойма ў *«Пацвярджэнні уніі...»* месцам правядзення вальных соймаў Рэчы Паспалітай была вызначана Варшава. Праўда агаворвалася, што ў надзвычайных сітуацыях і са згоды сенатараў соймавыя пасяджэнні маглі адбывацца і ў іншых гарадах. Тым не менш, супольныя соймы ўсё роўна павінны былі праходзіць толькі на тэрыторыі Кароны Польскай[29]. На нашу думку, такая сітуацыя тлумачыцца тым, што кіраўніцтва дэлегацыі ВКЛ глядзела на гэтае пытанне выключна ў кантэксце забеспячэння роўнага статусу вышэйшыхураднікаў Кароны і Вялікага Княства ў складзе Рэчы Паспалітай. Так, яшчэ 9 чэрвеня 1569 г. Я. Хадкевіч звяртаў увагу кароннага боку на тое, што правядзенне супольных соймаў толькі на землях Кароны значна абмяжуе юрысдыкцыю вялікакняжацкіх ураднікаў, у прыватнасці земскага маршалка і канцлера[30]. Пасля таго, як Жыгімонт Аўгуст 19 ліпеня 1569 г. часова размежаваў паўнамоцтвы маршалкаў Кароны і Вялікага Княства, што падрабязна будзе разгледжана ніжэй, то і пытанне аб правядзенні вальных соймаў Рэчы Паспалітай на землях ВКЛ сыйшло з павесткі дня сойма ў Любліне. На канчатковае рашэнне праводзіць соймы Рэчы Паспалітай выключна на землях Кароны паўплываў і сам змест унійнага пры-

Люблинского сейма 1569 года. С. 411, 415, 425; Halecki O. Dzieje unii jagiellońskiej. S. 321–334; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 169, 174.

[27] Гатовы былі згадзіцца на Берасце як на адно з месцаў правядзення супольных соймаў гнезненскі арцыбіскуп Якуб Уханьскі (Jakub Uchański), кракаўскі ваявода Станіслаў Мышкоўскі (Stanisław Myszkowski), інаўроцлаўскі ваявода Ян Кратоскі (Jan Krotoski): Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 493, 497, 500; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 201, 202, 204. Гл. таксама: Halecki O. Dzieje unii jagiellońskiej. S. 346.

[28] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 525; Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 242; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 211–212. Гл. таксама: Wisner H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita. S. 21.

[29] Гэты артыкул быў уключаны і ў соймавыя канстытуцыі (арт. 3): Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 243, 246. Гл. таксама: Błaszczyk G. Litwa na przełomie średniowiecza i nowożytności, 1492–1569. Poznań, 2002. S. 154; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 42.

[30] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 415.

вілея ад 1 ліпеня 1569 г., у якім гаварылася (арт. 16), што кароль «*заўсёды супольныя соймы тым абедзвюм нацыям як аднаму целу ў* ***Польшчы*** *(*вылучана намі — У.П.*) складаць будзе*»[31]. Безумоўна, што на адступленне ад літары толькі што зацверджанага акта уніі, кароль і каронны бок маглі пайсці толькі пад уплывам нейкіх надзвычайных абставінаў. Аднак, відаць па ўсім, на той момант велікакняжацкае прадстаўніцтва яшчэ не бачыла неабходнасці прынцыпова настойваць на пачарговым правядзенні вальных соймаў на землях Кароны і Вялікага Княства[32].

На соймавых пасяджэннях закраналіся яшчэ некаторыя аспекты функцыянавання парламенцкай сістэмы Рэчы Паспалітай. Так, земскія паслы ВКЛ прасілі Жыгімонта Аўгуста вызначыць, якім чынам соймавым паслам павінны аплочвацца выдаткі на паездку і працу на сойме (т.зв. *«опатрене на страву и выправу»*)[33]. Відавочна, што частка шляхты хацела, каб такія выдаткі кампенсаваліся не за кошт спецыяльнага павятовага падатку, а за кошт каралеўскага скарба, як тое было ў Кароне. Вядома, што яшчэ перад пачаткам Люблінскага сойма шляхта некаторых паветаў ВКЛ (напрыклад, Віленскага, Мазырскага) адмаўлялася аплочваць сваім прадстаўнікам дарогу ў Люблін і побыт там на час працы. Жыгімонт Аўгуст вымушаны быў забяспечыць такіх паслоў за грошы гаспадарскага скарба. Аднак у паветы ў лютым 1569 г. былі дасланы лісты з указаннем, каб шляхта ўхваліла спецыяльны падатак для ўтрымання сваіх паслоў і кампенсавала такім чынам выдаткі гаспадара[34]. З другога

[31] Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 237. Гэтая формула была ўнесена яшчэ ў каралеўскі прывілей ад 24 сакавіка 1569 г., у якім Жыгімонт Аўгуст зацвердзіў умовы будучай уніі паміж Каронай і Вялікім Княствам: Akta unii Polski z Litwą 1385–1791. S. 225.

[32] Тым не менш, ужо з часоў першага бескаралеўя (1572–1574 гг.) палітычны народ ВКЛ стаў актыўна дабівацца, каб вальныя соймы Рэчы Паспалітай праводзіліся па чарзе на землях Кароны і Вялікага Княства. Аднак дабіўся ён гэтага толькі ў другой палове XVII ст. Так, у 1653 г. надзвычайны сойм Рэчы Паспалітай быў праведзены ў Берасці, а ў 1673 г. было пранята рашэнне кожны трэці вальны сойм склікаць на тэрыторыі ВКЛ, а менавіта ў Гародні: Падалінскі У. Стаўленне шляхты Вялікага Княства Літоўскага да інстытута вальнага сойма ў канцы XVI ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2012. №8. С. 20; Rachuba A. Wielkie Księstwo... S. 176; Zakrzewski A. Paradoksy unifikacji prawa i ustroju Wielkiego Księstwa Litewskiego i Korony XVI–XVIII w. // Czasopismo Prawno-Historyczne. 1999. T. 51, z. 1–2. S. 223–224.

[33] Арт. 8: ДМАМЮ. С. 499; РИБ. Т. 30. Стб. 524.

[34] Любавский М. К. Литовско-русский сейм. Приложения. С. 213–215; Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика / Liet. istorijos inst. Kn. 531:

боку вядома, што шляхта некаторых іншых паветаў (у прыватнасці, Навагародскага) на сойміку перад Люблінскім соймам ухваліла адпаведны падатак на ўтрыманне сваіх паслоў[35]. У тым жа лютым 1569 г. у адказе на просьбу дэлегацыі Вялікага Княства вырашыць, з якіх сродкаў неабходна выплочваць «страву», Жыгімонт Аўгуст настойваў на захаванні звычаю забяспечваць соймавых паслоў за кошт паветаў[36]. Тым не менш, далёка не ўсё шляхецтва гатова было згадзіцца з такім падыходам, таму земскія паслы ВКЛ у ліпені–жніўні 1569 г. зноў звярнуліся да караля і вялікага князя з просьбай выдаць пастанову, якая б нарэшце вызначыла парадак утрымання павятовых паслоў. Жыгімонт Аўгуст, відавочна, не хацеў браць на свой скарб новыя выдаткі, тым больш тыя, што адносіліся да агульнадзяржаўных, земскіх патрэбаў, і вырашыў пакуль усё пакінуць, «*яко ся до того часу заховывало*», а ўласна разгляд гэтай праблемы перанёс на будучыя павятовыя соймікі[37]. Як аказалася, вырашэнне спрэчак аб аплаце дарогі і побыту на сойме паслоў зацягнулася ажно да канца XVI — пачатку XVII ст. У выніку, шляхта ў паветах і ваяводствах ВКЛ усё ж такі павінна была выплочваць спецыяльны падатак на забеспячэнне сваіх прадстаўнікоў[38].

Шэраг соймавых рашэнняў датычыў працы павятовых соймікаў у Рэчы Паспалітай. Так, у акце пацвярджэння уніі і кансты-

1567–1569 / Parengė L. Anužytė ir A. Baliulis. Vilnius, 2001. P. 142, 173–174. Гл. таксама: Listy króla Zygmunta Augusta do Radziwiłłów. S. 550–552, 552–554.

[35] Радаман А. Ухвалы соймікаў і шляхецкіх з'ездаў Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў сістэме нарматыўнага рэгулявання фінансавання соймавых паслоў у другой палове XVI–пачатку XVII ст. // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. Серыя 2. 2005. №4 (46). С. 16–18; Idem. Uchwała sejmikowa powiatu nowogródzkiego z 1568 r. a system finansowania posłów sejmowych Wielkiego Księstwa Litewskiego // Litwa w epoce Wazów. Prace ofiarowane Henrykowi Wisnerowi w siedemdziesiątą rocznicę urodzin. Warszawa, 2006. S. 145–156.

[36] Jaroszewicz J. Obraz Litwy… S. 191–192.

[37] Арт. 8: ДМАМЮ. С. 499; РИБ. Т. 30. Стб. 524.

[38] Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. Мінск, 1989. С. 116–117 (раздз. 3, арт. 7). Гл. таксама: Радаман А. Ухваленне мясцовых падаткаў на сойміках і шляхецкіх з'ездах Навагародскага ваяводства ВКЛ у другой палове XVI–пачатку XVII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2013. №9. С. 23–26; Rachuba A. Diety poselskie w Wielkim Księstwie Litewskim XVI–XVII wieku na przykładzie sejmiku żmudzkiego // Z dziejów kultury prawnej. Studia ofiarowane pr. J. Bardachowi w 90-lecie urodzin / oprac. red. H. Dziewanowska i K. Dziewanowska-Stefańczyk. Warszawa, 2004. S. 599–606; Radaman A. Uchwała sejmikowa powiatu nowogródzkiego z 1568 r. S. 145–156; Volumina Constitutionum. T. II (1550–1609), vol. 2 (1587–1609) / Do druku przygotował S. Grodziski, przedmowa W. Uruszczak. Warszawa, 2008. S. 246, 295.

туцыях сойма (арт. 3) вызначалася, што соймікі ў Кароне і Вялікім Княстве павінны склікацца і адбывацца «*паводле звычаю*». Акрамя таго ўдакладнялася, што каронная і велікакняжацкая канцылярыі павінны разсылаць соймавыя лісты, а мясцовыя старосты павінны абвяшчаць іх шляхце за два або тры тыдні да пачатку працы соймікаў[39]. Звернем увагу яшчэ на адзін цікавы момант. Так, 27 ліпеня земскія паслы перадалі на разгляд караля і сенатараў праект канстытуцый, сярод якіх утрымлівалася прапанова даручыць шляхце на павятовых сойміках абмеркаваць і «*звычай нейкі знайсці*», каб праца соймаў не цягнулася настолькі доўга[40]. У адказ на гэта Жыгімонт Аўгуст прапанаваў распачынаць соймавыя пасяджэнні выключна з вырашэння пытанняў абароны, што і дазволіць скараціць іх час. Аднак паслы, у прыватнасці пасол Кракаўскага ваяводства Станіслаў Шафранец (Stanisław Szafraniec), выступілі супраць такой ідэі, бо бачылі ў ёй проста спробу каралеўскай улады дабіцца ад шляхты хуткага ўхвалення падатакаў: «*А як толькі падатак ухваліце, то едзьце ж дадому калі хочаце, нічога болей не атрымаўшы*»[41]. Падобная пазіцыя магла быць блізкай і земскім прадстаўнікам Вялікага Княства Літоўскага. Прынамсі, на сойме ВКЛ 1568 г. паслы таксама не хацелі прыступаць да абмеркавання абароны, пакуль Жыгімонт Аўгуст не разгледзіць іх просьбы. Яны спасылаліся на вопыт папярэдніх соймаў, калі пасля ўхвалення сярэбшчыны кароль і вялікі князь адразу забываўся на ўсе просьбы, пададзеныя яму пасламі[42]. У выніку, Люблінскі сойм 1569 г. ніякіх

[39] Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 243, 246. Гл. таксама: Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 42–43. Заўважым, што ў чэрвені 1569 г. дэлегацыя ВКЛ узняла пытанне ўтварэння ў Вялікім Княстве, па прыкладзе Вялікай і Малой Польшчы, Галоўнага сойміка, які склікаўся б напярэдадні вальнага сойма. Аднак далейшага развіцця на сойме ў Любліне гэтая ідэя не атрымала: Halecki O. Dzieje unii jagiellońskiej. S. 322. Інстытут Галоўнага сойміка ў ВКЛ быў уведзены толькі паводле Генрыкавых артыкулаў 1573 г. (арт. 9), а склікацца пачаў з верасня 1576 г.: Rachuba A. Wielkie Księstwo… S. 152–153; Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 328, 357, 368.

[40] На працягу ліпеня–жніўня 1569 г. каронныя паслы часта скардзіліся на вельмі доўгі ды цяжкі побыт у Любліне і пагражалі хутка пакінуць пасяджэнні сойма. Так, М. Нарушэвіч 28 ліпеня паведамляў М. Радзівілу Рудому, што шмат сенатараў і земскіх паслоў ужо раз’ехаліся з Любліна, а з некаторых паветаў засталося ледзьве па адным паслу. Праўда, невядома, ці датычыла гэта і прадстаўнікоў ВКЛ: АСД. Т. 7. С. 48.

[41] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 588; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 234–235.

[42] Archiwum książąt Sanguszków w Sławucie. T. 7: 1554–1572. Lwów, 1910. S. 260–261. Гл. таксама: Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. С. 278.